Сачыненне
“Што такое адзінства”
Кухарчык Андрэй, 9 клас
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Заямнаўская сярэдняя школа”

Гэта быў нічым не адметны дзень. Але на душы ў Віці было ўрачыста. Ён упершыню без дапамогі мамы сам завязаў піянерскі гальштук і хацеў ужо ісці ў школу, як раптам адчуў на сабе позірк. Азірнуўся – вядома ж, бабуля!

– Які ты ўжо дарослы, – змахваючы слязу, сказала яна.

– Бабуля, не плач! Што здарылася?

– Нічога. Радуюся за цябе, што ты расцеш шчаслівым! Я ж ніколі і не насіла піянерскі гальштук – не давялося.

Віця паглядзеў на гадзіннік: да пачатку ўрокаў яшчэ шмат часу. Значыць, можна паразмаўляць з бабуляй.

– Бабуля, а раскажы што-небудзь пра майго прадзеда.

Віця ведаў, што прадзядуля жыў у Заходняй Беларусі, ды і бабуля нарадзілася там жа.

– Сям'я была вялікая ў яго – дзесяць дзяцей. Але ўсе жылі дружна, ніхто нікога не крыўдзіў. Была зямля, свая гаспадарка. Ды і працавалі таксама ўсе: і дарослыя, і дзеці. Бацька часта хадзіў на працу да багатых людзей. За гэта яму плацілі вельмі мала. Таму твой прадзед для дадатковага заробку змушаны быў працаваць на лесанарыхтоўцы. Памятаю, як ён казаў, што карэнныя беларусы лічыліся людзьмі "другога гатунку". Каб нечага дасягнуць, трэба было запісаць сябе палякам.

Нягледзячы ні на што твой прадзед імкнуўся вучыцца. На той час не было беларускіх школ, таму наведвалі польскія. Вучыліся таксама па-польску. Твой прадзядуля хадзіў у школу толькі ўзімку, а ў астатні час вымушаны быў дапамагаць бацькам. І толькі пасля ўз'яднання БССР і Заходняй Беларусі працягнуў вучобу. Пазней ён змог атрымаць адукацыю і стаў аграномам.

Прадзед твой заўсёды лічыў, што цэласнасць нашай рэспублікі – гэта шчасце для ўсёй краіны. Кошт яднання быў не меншы – была ліквідаваная мяжа, якая падзяліла лёсы людзей. Прадзядуля змог убачыць свайго брата, з якім не бачыўся цэлых дзесяць гадоў. Усе адчувалі перамены да лепшага пасля аб'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі. Аднак гэта працягвалася нядоўга. Неўзабаве пачалася вайна. Вайна...

Голас у бабулі задрыжаў.

– Ідзі, унучак, у школу спознішся.

Віця разумеў, чаму бабуля ледзь стрымлівала слёзы, чаму хацела застацца адна. Не раз ён чуў ад яе, што савецкі народ выстаяў у вайне, таму што быў адзіны. А калі на фронце гінуў нехта з блізкіх, аднавяскоўцы дапамагалі, хто чым мог. Хто бульбы прынясе, хто дроў падкіне. Адзінай сям'ёй жыла вёска. Адзінства – вось сіла! Так у адзінстве і выжылі, і Вялікую Перамогу сустрэлі.

Бабуля не раз прыводзіла прыклад з венікам. Адзін дубчык зламаць лёгка, а цэлы венік пасрабуй пераламаць – ніколі! Так і людзі: аднаго знішчыш, а ў адзінстве – сіла!

Віця ішоў у школу знаёмай яму дарогай, на грудзях чырванеў піянерскі гальштук. А думкі пасля размовы з бабуляй не пакідалі яго: «Дык вось што такое адзінства, аказваецца! Нават нашы размовы з бабуляй за кубкам гарбаты – гэта таксама адзінства. Мы ж адна сям'я. І мая трохгадовая сястра – гэта таксама як адно цэлае. Адзінства – гэта тое, як мы аддаём сябе не толькі блізкім, але і таму кавалачку зямлі, на якім мы жывём. І не выпадкова ў гімне нашай краіны ёсць словы: «Мы, беларусы - мірныя людзі, Сэрцам адданыя роднай зямлі... Разам з братамі мужна вякамі Мы баранілі родны парог... Дружба народаў – сіла народаў... ». Гэтае таксама адзінства. Мы адна сям'я. І толькі ў адзінстве мы непераможныя».

І так добра стала Віцю на душы, так светла. Ды і сонейка свяціла неяк па-асабліваму. Таксама, мусіць, адчувала сваё адзінства з усім светам. А ў галаве ўжо праносіліся радкі:

**А**дзін нішто ў гэтым свеце,
Дзе слёзы, скруха і туман.
**З**нішчаць усё могуць на планеце,
**І** пыл у вочы – то падман.
**Н**яхай жа людзі жывуць дружна,
**С**ябруюць хай суседзі ў нас,
**Т**ады адной сям’ёй мы будзем,
**В**ядомай усім,
**А**дзінай кожны дзень і кожны час.